ЛИТЕРАТУРА

1. Совместное заявление Папы Римского Франциска и Святейшего Патриарха Кирилла 13 февраля 2016 г. [Электронный ресурс]. – Режим доступа : http: // patriarchia.ru. db/text/ 4372074. – Дата доступа: 02.03.2020.
2. *Болотов, В. В.* Лекции по истории древней церкви: в 4 т. / В. В. Болотов. – М., 1994. – Т. 3, 4.
3. *Лебедев, А. П.* История восточной церкви под властью турок / А. П. Лебедев. – СПб, 2004. – Кн.1, 2.

*Поступила в редакцию 31.03.2020*

**А. М. Кушнярэвіч-Шпэт**

# ГЕРМАНСКІ КАМПАНЕНТ ЭТНАКУЛЬТУРНАЙ ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСІ XIII–XVIII ст.

В статье рассмотрен процесс формирования немецкого этнического меншинства на территории белорусских земель в эпоху Средневековья и Нового времени. Характеризуются причины и состав миграционных и переселенческих потоков на каждом этапе. Называются места исхода этнических мигрантов и переселенцев, а также их расселения в Беларуси. Отмечается большая роль немецких живописцев, архитекторов в развитии белорусского искусства XVII–XVIII вв.

Вывучэнне этнічнай гісторыі таго альбо іншага народа, пытанні міжэтнічных кантактаў, узаемаадносін, узаемаўплываў і ўзаемаўзбагачэння нацыянальных культур заўжды былі і застаюцца актуальнымі праблемамі сучаснай этнакультуралогіі. У ракурсе ўзаемадзеяння культур асаблівае значэнне сёння набываюць праблемы фарміравання, развіцця і сучаснага стану этнічных меншасцяў, якія пражываюць за межамі асноўнай этнічнай тэрыторыі. Да аднаго з такіх этнакультурных утварэнняў адносяцца і беларускія немцы. Таму мэта публікацыі – прааналізаваць працэс, характар і матывы міграцый і перасяленняў этнічных груп немцаў на тэрыторыі Беларусі ў рамках распрацоўкі аднаго з раздзелаў індывідуальнай навуковай тэмы, прысвечанай германа-беларускім этнакультурным кантактам XIII–XIX ст. ва ўсёй іх разнастайнасці.

Першыя гістарычныя звесткі пра кантакты крывічоў з немцамі адносяцца да X ст. Пра гэта павядамляе славуты германскі храніст Дзітрых, апавядаючы, як святы Бруна прапагандаваў хрысціянства ў Прусіі на мяжы з Руссю [1, с. 3]. У далейшым нямецкія манахі працягвалі дзейнасць па распаўсюджванні хрысціянскай веры на ўсход, таму менавіта немцы аднымі з першых прынеслі каталіцтва на тэрыторыю сучаснай Беларусі. Так, на захадзе Беларусі ў канцы X – пачатку XI ст. хрысціянства абвяшчаў немец Бруна Кверфурцкі. У гэты ж час каля 1010–1013 гг. у Тураў прыбыла місія калабжэгскага біскупа Рэйнберна, запрошанага мясцовым князем Свята-

полкам. Да таго ж, мясцовыя князі паступова завязваюць з немцамі і роднасныя адносіны. Так, з немкамі ажаніўся шэраг беларускіх князёў, напрыклад, полацкі князь Ізяслаў Мсціслававіч быў жанаты з Агнесай, дачкой Конрада III з Гогенштаўфенаў, а тураўскі князь Яраполк Ізяслávіч меў шлюб з Кунігундай фон Орлямюндэ, якая была дачкой графа Веймера Атона I [2].

Місіянерская дзейнасць нямецкіх святароў працягнулася і ў канцы XII ст., калі ў 1185 г. аўгусцінскі манах Мейнард, пасланы брэменскім архібіскупам Гортвігам, прыбыў у мястэчка Іскуль каля Заходняй Дзвіны і па пагадненні з полацкім князем Уладзімірам пачаў хрысціянізацыю ліваў. Паказальна, што полацкі князь Уладзімір не толькі прыхільна паставіўся да з’яўлення побач са сваімі ўладаннямі немцаў, бо дазволіў нямецкаму манаху Мейнарду заснаваць замак і касцёл і пачаць хрысціць ліваў, але і паслаў яму свае дары. У далейшым стасункі полацкіх князёў з пераемнікамі Мейнарда, галоўным чынам з лівонскім біскупам Альбертам, які заснаваў у вусці Дзвіны ў 1201 г. горад Рыгу, сталіцу Лівонскага ордэна, былі не заўсёды простымі. Перыяды актыўнай канфрантацыі чаргаваліся з пошукамі збліжэння [3, с. 5], у выніку якіх у сярэдзіне XIII ст. у Полацку з’явіліся нямецкія місіянеры, якія заснавалі там каталіцкае біскупства і пабудавалі касцёл. У той час у горадзе маглі знаходзіцца клірыкі, ордэнскія рыцары і купцы. Аднак адмаўленне ў хуткім часе немцаў ад місіі па Дзвіне асудзіла на заняпад у ім лацінскага касцёла і біскупскай рэзідэнцыі [4, с. 209]. Нямецкае місіянерства і каланізацыя Ніжняга Падзвіння не ўяўляла тады пагрозу для Русі, бо немцы кіраваліся там найперш эканамічнымі інтарэсамі. Нямецкія ж ваенныя сілы ва Усходняй Прыбалтыцы былі дастаткова абмежаванымі і да XIVст. не рабілі паходаў супраць Полацкай зямлі [5, с. 46]. У 1305 г. Полацк падпаў пад залежнасць рыжскага архібіскупа, што выклікала засяленне Полацка і Полацкай зямлі немцамі, якія займаліся там гандлем і распаўсюджвалі каталіцтва, пабудавалі ў Полацку касцёл, але ў 1307 г. былі выгнаны вялікім літоўскім князем Віценем. Нягледзячы на гэта, Полацк заставаўся адным з цэнтраў кампактнага пражывання нямецкага насельніцтва Вялікагі Княства Літоўскага (ВКЛ) і буйным шматнацыянальным горадам. На той момант у горадзе існаваў нямецкі раён, дзе жылі нямецкія гандляры, асветнікі, лекары, ваенныя. З’яўленне немцаў у Полацкім княстве адбывалася шляхам пашырэння гандлёвых і міжкультурных сувязяў з нямецкімі і польскімі гарадамі [2]. Таму ўжо ў канцы XII – пачатку XIII ст. Полацкая зямля мела развітыя гандлёвыя сувязі з ганзейскімі гарадамі – Рыгай, Данцыгам, Ростакам, Любекам, Кёльнам і іншымі факторыямі. Купцы Полацкай зямлі, як і Смаленска, мелі свае прадстаўніцтвы ў Рызе амаль з самага пачатку яе заснавання. У другой палове XII ст. нямецкія купцы пабудавалі храм у Смаленску, а ў першай палове XIII ст. – у Полацку. У Віцебску таксама функцыянаваў іх гандлёвы двор і быў, напэўна, узведзены каталіцкі храм. У канцы XIV ст. купцы з Гародні (Гродна), Бярэсця (Брэста), Полацка часта наведвалі многія нямецкія гарады. У гэты час абшчыны немцаў існавалі ў Полацку, Вільна, Бярэсці, Гародні [5, с. 46–47].

Новы этап фарміравання нямецкіх абшчын на беларускіх землях наступіў у перыяд Вялікага Княства Літоўскага, дзяржаўна-палітычнаму ладу якога ўласцівы дэмакратызм і талерантнасць, суіснаванне побач розных этнаканфесійных груп са сваімі глыбока нацыянальнымі традыцыямі і звычаямі, свабода адпраўлення абрадаў і верацярпімасць.

Першыя нямецкія мігранты – дамініканскія і францысканскія манахі, якія заснавалі ў Вільні і Навагрудку дзве каталіцкія царквы, – з'явіліся ў ВКЛ у пачатку XIV ст. [6, S. 518–519]. Адным з тых, хто спрыяў рассяленню немцаў у ВКЛ, быў вялікі князь літоўскі Гедымін, які ў рамках урэгулявання зносін з Лівонскім ордэнам у 1323–1324 гг. выдаў звароты на латыні, адрасаваныя Папу Рымскаму Яну XXII, уладам ганзейскіх гарадоў Брэмена, Кёльна, Любека, Ростака, Грэйсфальда, Штэціна, Штральзунда і інш., а таксама нямецкіх, французскіх і дацкіх. У зваротах Гедымін заяўляў пра жаданне прыняць хрысціянскую веру [7, S. 147]. Акрамя таго, у ВКЛ запрашаліся да пастаяннай аселасці рыцары, лекары, рамеснікі шаўцы, цялежнікі, каменячосы, срэбнікі, балістарыі, солездабытчыкі, пекары, купцы, землярobы, рыбакі, а таксама святары. Усім запрошаным гарантавалася бяспека, свабода перамяшчэння, поўнае ці на некалькі гадоў вызваленне ад падаткаў і павінасцяў. Асаблівую ўвагу прыцягвае дазвол Гедыміна нямецкім каланістам карыстацца гарадскім правам, аналагічным таму, якім карысталіся мяшчане Рыгі [8, с. 25]. Таму ўмовы, што ім былі прапанаваны, вельмі моцна нагадваюць тыя, на якіх нямецкія перасяленцы засялялі краіны Цэнтральнай Еўропы. Невядома, ці быў увасоблены на практыцы гэты яго дазвол, аднак падобна на тое, што пранікненне на землі ВКЛ нямецкіх каланістаў і, што вельмі важна, нямецкага гарадскога права пачалося даволі рана, значна раней, чым звычайна прынята лічыць. Аднак інтэнсіўнасць, з якой нямецкія перасяленцы засялялі абшары гэтай дзяржавы, была, відаць, значна больш сціплай, чым у каталіцкіх краінах Цэнтральнай Еўропы [3, с. 8]. У XIV ст. ВКЛ вяло актыўны гандаль з ганзейскімі гарадамі. У Полацку, Троках і Вільні з'яўляюцца нямецкія гандлёвыя двары. Іх фарміраванне ў ВКЛ працягвалася да XVI ст. У асноўным немцы сяліліся ў буйных гарадах ВКЛ, вялікі іх працэнт сярод гарадскога насельніцтва быў у Вільні, Полацку, Магілёве, Горадні, Бярэсці і іншых гарадах. У XV–XVI ст. нешматлікія групы немцаў перасяляліся па эканамічных прычынах найперш у Віцебск і Полацк. Там яны даволі хутка асіміляваліся сярод мясцовага гарадскога насельніцтва [2].

У 1563 г. на землях князёў Радзівілаў па іх асабістым запрашэнні вялікая група нямецкіх і галандскіх сялян пасялілася каля Буга і заснавала вёскі Нойдарф і Нойбрун, да якіх пазней накіроўваліся шматлікія перасяленцы. У хуткім часе ў Берасцейскім ваяводстве ўзнік царкоўны прыход Нойдарф-Нойбаў, дзякуючы якому нямецкія сяляне ў адрыве ад гістарычнай радзімы падтрымлівалі сувязь з роднай культурай. Да канца XVIII ст. такія паселішчы распаўсюдзіліся да Кобрына. Нойдарф-Нойбаў дасягнуў вялікіх памераў і меў шчыльныя сувязі з нямецкімі пасяленнямі на Валыні [9, с. 30].

Нямецкае паселішча на Магілёўшчыне захавалася і дагэтуль – цяпер гэта вёска Вейна (ад ням. *Wein* 'віно'). З XVI ст. назіраецца прыток у ВКЛ у першую чаргу нямецкіх навукоўцаў, медыкаў, рамеснікаў, разам з тым павялічваецца колькасць нямецкіх ваенных-наймітаў, якія фактычна становяцца неад'емнай часткай арміі ВКЛ і Рэчы Паспалітай. Так, адным з гераічных абаронцаў Смаленска ад маскоўскіх войск стаў немец Корф. Аднак у XVI ст., як і раней, значную групу нямецкага насельніцтва ВКЛ складалі гандляры [2]. Таму невыпадкова, што дамінуючым элементам горадабудаўнічай структуры Гародні, якая цягнулася па-над Гараднічанкай, быў Нямецкі рынак, што выконваў ролю другога гандлёвага асяродка горада. Рынак з назвай «Нямецкі» быў заснаваны тут яшчэ ў перадмагдэбургскі перыяд (1496) гісторыі Гародні. Сведчаннем гэтаму служыць выяўлены тут падчас археалагічных даследаванняў посуд мазавецкага тыпу. На працягу ўсяго XV – першай паловы XVI ст. Нямецкі рынак заставаўся важным планіровачным элементам горада [10, с. 18].

Немцы значна паўплывалі на Рэфармацыю ў ВКЛ. Першапачаткова лютэранства збольшага прымалі месцічы-немцы, з мясцовых – зусім нязначная доля жыхароў. Так, у сярэдзіне XVI ст. нямецкія купцы заснавалі у Вільні лютэранскую суполку, якая хутка становіцца цэнтрам пашырэння лютэранства ў ВКЛ. У 1539 г. віленскі ўраджэнец, ксёндз і доктар філасофіі Абрагам Кульва адчыніў у Вільні школу для шляхецкай моладзі і актыўна выступаў з лютэранскімі пропаведзямі, слухаць якія збіралася ці не ўсё нямецкае насельніцтва горада. Пасля яго ад'езду прапаведнікам лютэранства ў Літве стаў Ян Вінклер, ксёндз віленскага касцёла Св. Ганны. У час наступлення Контррэфармацыі Віленскі біскуп забараніў яму не толькі служыць, але і ўвогуле з'яўляцца ў віленскіх касцёлах. Тады Вінклер адчыніў лютэранскую малельню ў хаце віленскага купца Морштына. Утварылася лютэранская суполка, у асноўным з немцаў. У хуткім часе на Нямецкай вуліцы збудавалі кірху, якая праіснавала да 1944 г. [2]. Пражывалі немцы і ў Слуцку. Так, першае згадванне яго лютэранскай суполкі адносіцца да 1535 г., калі князь Юрый Алелькавіч вылучыў немцам зямлю пад кірху [11, с. 54]. У Мінску таксама існавала лютэранская суполка, якую ўзначальваў нямецкі пастар Карл Людвіг Гемерых, які дагэтуль быў пастарам у Слуцку [12, с. 173]. Вялікая колькасць немцаў прыбыла ў ВКЛ па запрашэнні Радзівілаў дзеля пашырэння Рэфармацыі, як, напрыклад, Ян Фёлькель, а ў час ваяводскага кіравання Януша Радзівіла немец-лютэранін Якуб Гібель нават стаў войтам Вільні. Вялікія князі літоўскія лічылі неабходным паскорыць гаспадарчае развіццё сваёй дзяржавы і з гэтай нагоды запрашалі перасяленцаў як з Германіі, так і з усёй Еўропы (Венгрыя, Чэхія, Францыя, Шатландыя) [13, с. 310].

Важную ролю ў развіцці айчыннай культуры XVII–XVIII ст. адыгрывала запрашэнне ў ВКЛ славутых еўрапейскіх жывапісцаў, архітэктараў, музыкантаў і г.д., сярод якіх было шмат немцаў (А. Бінк, А. Вайдэ і Г. Гельвіг, Е. Нойнхерц, Б. Стробель, І. Шрэтар, А. Крэмер, І. К. Глаўбіц, М. Д. Пёпельман,

Я. С. Бекер і інш.) [14, с. 100, 105; 15, с. 111–112], якія спрыялі далучэнню беларускага мастацтва да барочна-класіцыстычных накірункаў развіцця еўрапейскай культуры [16].

Шмат немцаў было і сярод настаўнікаў. Так, у шырока вядомай праваслаўнай Віленскай брацкай школе большую іх частку складалі немцы-пратэстанты. Сапраўдным цэнтрам нямецкай культуры ВКЛ становіцца Вільня. Ужо з самага заснавання горада вялікія князі літоўскія запрашаюць у горад нямецкіх жыхароў. Немцы, пераважна купцы і рамеснікі з ганзейскіх гарадоў, кампактна пражывалі на Нямецкай вуліцы, дзе яны сяліліся яшчэ з часоў Альгерда [2].

Некаторая колькасць немцаў прыбывае ў ВКЛ у XVIII ст. у час кіравання Аўгуста II (1694–1709) і Аўгуста III (1734–1763) з Саксоніі, акрамя таго, асобныя нямецкія арыстакратычныя сем'і пераязджаюць з Прыбалтыкі. Новая хваля перасялення немцаў у ВКЛ пачалася ў 60–70 гг. XVIII ст. і была выклікана Сямігадовай вайной (1756–1763) – адным з маштабных міжнародных канфліктаў Новага часу, у якім прынялі ўдзел усе буйныя еўрапейскія дзяржавы. У выніку пачаўся чарговы этап у гісторыі немцаў на Беларусі. У канцы XVIII ст. прыбывалі на беларускія землі ў асноўным немцы з поўдня Германіі, якія размаўлялі на швабскім дыялекце. Перасяленне было выклікана эканамічнымі і гаспадарчымі праблемамі, што прынесла працяглая вайна, вялікай шчыльнасцю насельніцтва гэтага рэгіёна і як вынік павышаным коштам на зямлю, у той час як у ВКЛ зямля каштавала параўнальна танна, была магчымасць набыць не толькі зямлю, але і маёнтак, а таксама лес. Вялікая колькасць гэтых немцаў асела на Віленшчыне і Ковеншчыне, а таксама на Гродзеншчыне і Беласточчыне, некаторыя з іх пераехалі ў Нойдарф [13, с. 311]. У 1793 г. кароль і вялікі князь Станіслаў Аўгуст Панятоўскі імяннай граматай дараваў лютэранскай суполцы дом з зямлёй на Гарадніцы. У Гародні тады была нямецкая слабада – Занёманскі фарштат, дзе размяшчаліся хаты і майстэрні мясцовых немцаў. Менавіта ў гэтым годзе ў Гродна збудавалі лютэранскую кірху Св. Яна. У XVIII ст. колькасць нямецкіх мігрантаў істотна павялічылася на беларускіх землях. У выніку ў 1775 г. у Полацку і Магілёве ўзніклі лютэранскія суполкі немцаў, пры гэтым былі заснаваны лютэранскія кірхі. Лютэранская суполка існавала і ў Мінску, дзе ў 1846 г. была ўзведзена мураваная лютэранская кірха даволі вялікіх памераў. У XVIII ст., як і пазней, значны след ў грамадска-палітычным і культурным жыцці Беларусі пакінулі прадстаўнікі шэрага шляхецкіх родаў нямецкага паходжання – Тызенгаўзаў, Плятэраў, Остэнсакенаў, Лялевеляў, Путкамэраў, Корфаў [2]. Сярод беларускай магнатэрыі самым цесным чынам з Германіяй былі звязаны Радзівілы. Вядома, што ваявода і каштэлян Віленскі, ардынат Клецкі Міхал Іеранім Радзівіл прыехаў у Берлін, тады сталіцу Прускага каралеўства, у красавіку 1795 г. разам з сям'ёй. Адразу ж Радзівілы сталіся набліжаныя пры двары Гогенцолернаў, а ў сакавіку 1796 г. сын князя Міхала Антон Генрых ажаніўся з Фрэдэрыкай Даратэяй Луізай Філіпінай Гогенцолерн – кузінай прускага караля Фрыдрыха

Вільгельма ІІ. Менавіта ад гэтага шлюбу нарадзіліся Вільгельм і Багуслаў Фрэдэрык – будучыя спадчыннікі асноўных радзівілаўскіх валоданняў у Расійскай імперыі, заснавальнікі Нясвіжскай і Алыцкай ардынацкіх ліній Радзівілаў у другой палове XIX–XX ст.[17, с. 320].

Такім чынам, фарміраванне нямецкай этнічнай меншасці ў XIII–XVIII ст. на беларускіх землях адбывалася ў некалькі этапаў, якія былі абумоўлены маштабнымі эканамічнымі, палітычнымі працэсамі, культурнымі падзеямі. Першапачаткова нямецкая прысутнасць была прадстаўлена на Беларусі місіянерамі па распаўсюджванні заходняга хрысціянства. Усталяванню германа-беларускіх этнакультурных кантактаў садзейнічалі дынастычныя шлюбы мясцовых князёў з прынцэсамі германскіх уладных дамоў. У часы Полацкага княства сфарміраваліся факторыі нямецкіх купцоў у шэрагу беларускіх гарадоў. Таму немцы з'яўляюцца адной з самых старажытных этнічных меншасцяў на тэрыторыі Беларусі. У перыяд ВКЛ яны запрашаліся на беларускія землі ў кантэксце дзяржаўнай палітыкі па шырокай эканамічнай, культурнай і ваеннай мадэрнізацыі гэтай балта-славянскай дзяржавы. Аднак інтэнсіўнасць, з якой нямецкія перасяленцы яе засялялі, хутчэй за ўсё была больш сціплай, чым у каталіцкіх краінах Цэнтральнай Еўропы. У асноўным у XIV–XVI ст. нешматлікія групы немцаў перасяляліся па эканамічных прычынах найперш у буйныя беларускія гарады, дзе паступова сфарміраваўся іх кампактны тэрытарыяльна-культурны сегмент, што знайшло адлюстраванне ў гарадской тапаніміцы і архітэктуры. У XVIII ст. асобныя нямецкія пасяленні ствараліся шляхам аб'яднання перасяленцаў па нямецкіх этнаграфічных групах, што мелі аднолькавыя месцы ранейшага пражывання. Таму на гэтай стадыі германа-беларускіх этнакультурных кантактаў у шэрагу выпадкаў назіраўся анклаўны спосаб пражывання нямецкіх перасяленцаў, які садзейнічаў іх тэрытарыяльна-культурнай і культурна-бытавой кансалідацыі. Аднак у асноўным пераважаў дысперсны характар рассяленя немцаў на беларускіх землях невялікімі групамі, што стала неспрыяльным фактарам у развіцці і захаванні іх мовы і культуры. Перасяленні ж немцаў на ўсход насілі як індывідуальны, так і групавы характар.

## ЛІТАРАТУРА


1. *Саверчанка, І.* Беларусь – Нямеччына: штрыхі супрацоўніцтва X–XVIII ст. / І. Саверчанка // Культура. – 1993. – № 18. – С. 3–5.
2. Немцы ў Беларусі [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу : https://be.wikipedia.org/wiki. – Дата доступу : 27.02.20.
3. *Бохан, Ю.* Перадумовы новага ўрбанізацыйнага этапу на беларускіх землях ВКЛ у XIV–XV ст. / Ю. Бохан // Беларускі гістарычны часопіс. – 2016. – № 10. – С. 5–9.
4. *Сагановіч, Г.* Штодзённае жыццё немцаў у сярэднявечным Полацку / Г. Сагановіч // Гісторыя штодзённасці і правы чалавека : матэрыялы міжнар. навук. канф. – Мінск., 1999. – С. 209–210.

5. *Сагановіч, Г.* Сярэднявечная Беларусь і немцы: сустрэча культур / Г. Сагановіч // Гістарычная навука і гістарычная адукацыя ў Рэспубліцы Беларусь: стан і перспектывы развіцця: матэрыялы II Усебеларус. канф. гісторыкаў / Ін-т гісторыі НАН Беларусі ; рэдкал.: А. А. Каваленя [і інш.]. – Мінск: Белнавука, 1999. – С.46–48.
6. *Narbutt, T.* Dzieje starożytne narodu Litewckiego / T. Narbutt. – Wilno, 1839. – T. 5. – 629 s.
7.Codex Epistolaric Vitoldi, magniducis Lithuaniat (1376–1430). – Kraków, 1882. – 328 s.
8. *Дзярновіч, А. І.* Заняпад ці трансфармацыя? Эвалюцыя Крэўскага замка ў XIV–XVII ст. (па выніках гістарычна-археалагічных даследаванняў) / А. І. Дзярновіч // Замкі, палацы і сядзібы ў кантэксце еўрапейскай культуры: зб. навук. арт. / М-ва культуры Рэсп. Беларусь, Установа «Музей "Замкавы комплекс "Мір"» ; рэдкал.: В. М. Папко [і інш.]. – Мінск: Медысонт, 2013. – С. 23–29.
9. *Тугай, В. В.* Немецкий этнос в Беларуси в XIV–30-х гг. XX в. / В. В. Тугай // Европа : актуальные проблемы этнокультуры : материалы II Междунар. науч.-теорет. конф., г. Минск, 25 апр. 2008 г. / Белорус. гос. пед. ун-т им. М. Танка ; редкол. : В. В. Тугай (отв. ред.) [и др.]. – Минск : БГПУ, 2015. – С. 30–35.
10. *Гардзееў, Ю.* Да пытання аб планіроўцы Гародні ў другой палове XIII – першай палове XV ст. / Ю. Гардзееў // Гістарычны альманах. – 1998. – Т. 1. – С. 16–25.
11. *Акіньчыц, С.* Горад, дзе захавалася традыцыя / С. Акіньчыц // Спадчына. – 2003. – № 1. – С. 52–56.
12. *Арлоў, У.* Краіна Беларусь. Ілюстраваная гісторыя / У. Арлоў, З. Герасімовіч. – Martin, Slowakia. – 2003. – 280 с.
13. *Навагродзкі, Т. А.* // Этналогія Беларусі: традыцыйная культура насельніцтва ў гістарычнай перспектыве: вучэб.-метад. дапам. / Т. А. Навагродзкі. – Мінск : БДУ, 2009. – 335 с.
14. *Хадыка, А. Ю.* Непаўторныя рысы: З гісторыі беларускага партрэта / А. Ю. Хадыка, Ю. В. Хадыка. – Мінск : Навука і тэхніка, 1992. – 144 с.
15. *Кулагін, А. М.* Элітная архітэктура барока Беларусі ў агульнаеўрапейскім кантэксце / А. М. Кулагін // Барока ў беларускай культуры і мастацтве / Ін-т маст-ва, этнагр. і фальклору НАН Беларусі; навук. рэд. В. Ф. Шматаў. – Мінск: Белнавука, 1998. – С. 103–121.
16. *Кушнярэвіч, А.М.* Гісторыя вывучэння нямецкіх уплываў у беларускім мастацтве / А. М. Кушнярэвіч // Пытанні мастацтвазнаўства, этналогіі і фалькларыстыкі: зб. навук. артыкулаў / Цэнтр даследаванняў беларус. культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі ; адк. рэд. А. І. Лакотка. – Мінск : Права і эканоміка, 2019. – Вып. 26. – С. 44–49.
17. *Карашчанка, І.* Немцы / І. Карашчанка, А. Майснер // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6 т. / рэдкал.: Г. П. Пашкоў [і інш.]. – Мінск : БелЭн, 1999. – Т. 5. – С. 319–320.

*Поступила в редакцию 23.03.2020*